## Мой Слаўгарад

Ёсць шмат прыгожых беларускіх гарадоў,
Але для кожнага адзіны ў свеце, сэрцы
Той горад, дзе твой зараз дом бацькоў.
Малой Радзімай называем тое месца.

Мой Слаўгарад, любуюсь я табой.
На замкавай гары стаяў палац тут дзіўны,
Расце і дуб у парку шмат гадоў,
Пасаджаны царыцай Кацярынай.

Ёсць станцыя паштовая, там Пушкін пабываў,
Аб гэтым мы ніколі не забудзем.
А князь Галіцын тут царкву пабудаваў,
Пакінуў памяць аб сабе ён добрым людзям.

І ёсць нямала месцаў гістарычных,
Дзе воіны ішлі бясстрашна ў бой.
Тут Пётр Першы ў змаганні гераічным
Адолеў шведаў каля вёсачкі Лясной.

На Слаўгарадчыне можна падзівіцца
Жамчужынай, што радуе нам сэрца.
З гаючаю, чысцюткаю вадзіцай.
Блакітнаю крыніцаю завецца.

Не толькі гістарычныя мясціны
Нас вабяць прыгажосцю, хараством!
Які цудоўны край наш, мілы, дзіўны!
Як добра, што мы ў Слаўным горадзе жывём!.